Источник: **«Звязда» - 2012-06-26**

# Медыяпрастора

### "Маладосць"

Хочаце пазнаёміцца з "Гісторыяй адной Антантыды", трапіць на "Нулявы кіламетр" ці ацаніць "Дом"? Чытайце апавяданні Святланы Саўко — выдатныя, поўныя кранальнага псіхалагізму "спіскі" з жыцця.

Буйная празаічная форма нумара — аповесць Валянціны Кадзетавай "Артыкул 7Б" — адсылае чытача ў нядаўняе мінулае, у той час як апавяданне Жанны Капусты "Вы яшчэ не чыталі", цалкам магчыма, дае прагноз на будучыню. Выдатныя ўзоры творчасці прадставілі паэты Алесь Спіцын, Віка Трэнас і Таццяна Сівец. Дэбютанты нумара — Марына Маркевіч (вершаваныя ўражанні) і Яўген Мартыновіч (лірычная проза). Увогуле, гэты нумар ствараўся так, каб да дня нараджэння Янкі Купалы і святкавання Купалля ён мог трапіць у рукі чытачоў, дэманструючы лісты з асабістага архіва жонкі паэта-юбіляра і ўспаміны пра пошукі бабкі-павітухі, што прыняла на белы свет генія, або даючы некаторыя дакладныя звесткі пра тое, дзе шукаць папараць-кветку і як паводзіць сябе пры сустрэчы з русалкамі...

### "Нёман"

Кожны чалавек, вядомая гэта асоба ці просты вясковец, годны стаць героем мастацкага твора. Галоўнае, каб пра яго жыццё было расказана таленавіта. У аповесці "Жытная баба" Аляксандра Валковіча гаворка ідзе пра лёс простай сялянкі, якая змагла захаваць годнасць і дабрыню ў самых складаных жыццёвых перыпетыях.

Псіхалагічна-дэтэктыўнае апавяданне Аляксандра Брыта "Ты толькі чырыкні" распавядае пра сілу бацькоўскага кахання да дачкі... Гісторыя пра тое, як герой прагне справядлівасці і пакарання вінаватых.

Апавяданне Васіля Ткачова "Вуліца Бабушкіна" можна аднесці да катэгорыі забаўляльных — яно, несумнеўна, выкліча ўсмешку ў тых, хто прачытае яго.

"...Я ціха ненавідзела чалавека, які валодае ўладай уключаць і выключаць мае вочы як настольную лямпу..." — піша ў мініяцюрах-споведзях "Лета нашых надзей" трыццацігадовая жанчына, якая пакутуе ад непаразумення і адзіноты. Гэта першая публікацыя ў "Нёмане" Ганны Васільевай, маладой жанчыны, якая рана пайшла з жыцця, а мініяцюры засталіся як сведчанне яе таленту, думак і перажыванняў.

Паэзія на старонках часопіса прадстаўлена падборкамі вершаў Генадзя Пашкова, Яна Пехцерава, Любові Турбіной.

130-годдзю Янкі Купалы прысвячаецца літаратуразнаўчае даследаванне доктара філалагічных навук Вячаслава Рагойшы "Першая з вяршыняў".

З шостага нумара ў часопісе з'явілася новая рубрыка "P.S. Апошнія старонкі", у якой можна прачытаць невялікія арыгінальныя артыкулы пра пісьменнікаў, гістарычныя даследаванні і навіны культурнага жыцця.

**"Полымя"**

У чэрвеньскім нумары часопіса "Полымя" друкуецца пачатак рамана Уладзіміра Гніламёдава "Ліхалецце", прысвечанага падзеям Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі. Проза прадстаўлена таксама аповесцю Валянціны Кадзетавай "Таннае золата" і апавяданнямі Уладзіміра Дуктава "Апёк", "Аднакашнікі".

З вершамі выступаюць паэты Мікола Маляўка, Кастусь Жук, Ірына Карэліна (пераклад з рускай Рагнеда Малахоўскага).

У раздзеле "Са спадчыны" — вершы Паўла Пруднікава і працяг кнігі пра кнігі Янкі Сіпакова "Мая бібліятэка".

130-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы прысвечаны матэрыялы "круглага стала", праведзенага сумесна з Аддзяленнем гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, — "Нам засталася спадчына", у якім бралі ўдзел вядомыя пісьменнікі і навукоўцы Аляксандр Каваленя, Мікола Мятліцкі, Алесь Карлюкевіч, Андрэй Унучак, Сяргей Гаранін, Міхась Мушынскі, Міхась Касцюк, Вераніка Ярмалінская, Ігар Шаладонаў, Міхась Тычына, Сцяпан Лаўшук, Алесь Бадак, Алесь Марціновіч і іншыя.

Зацікавяць чытачоў і навуковая публікацыя Ганны Мятліцкай, і краязнаўчы матэрыял Арцёма Хаменкі. Рэцэнзіі на новыя кнігі друкуюцца пад рубрыкай "Кнігарня".